Кобрынская раённая цэнтралізаваная
бібліятэчная сістэма
Цэнтральная раённая бібліятэка
Аддзел абслугоўвання і інфармацыі

# Ігар Сідарук:
# «Іншым разам радок дыктуе само неба...»

Біябібліяграфічны паказальнік
да 60-годдзя з дня нараджэння
**Ігара Фёдаравіча Сідарука**

2-е выданне, дапрацаванае
і дапоўненае

Кобрын
2024

УДК 016:82.09(476.7)(092)
ББК 91.9:83(4Беи)
І26

***Складальнік***
*С. Д. Курачук* - бібліёграф І катэгорыі
аддзела абслугоўвання і інфармацыі
Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі

І26 **Ігар Сідарук: «Іншым разам радок дыктуе само неба…»** : біябібліяграфічны паказальнік / Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; складальнік С. Д. Курачук. – Кобрын, 2024. - 40 с. : фат.

Біябібліяграфічны паказальнік прысвячаецца жыццю і творчасці кобрынскага пісьменніка, паэта, драматурга, фатографа Ігара Сідарука.

**УДК 016:82.09(476.7)(092)**
**ББК 91.9:83(4Беи)**

© Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка, 2024

# АД СКЛАДАЛЬНІКА

Біябібліяграфічны паказальнік прысвячаецца жыццю і творчасці кобрынскага пісьменніка, паэта, драматурга, фатографа Ігара Фёдаравіча Сідарука, які ў 2024 годзе адзначае 60-годдзе з дня нараджэння. Гэта 2-е выданне, дапрацаванае і дапоўненае.

Ігар Сідарук - паэт, цікавы празаік. Яго імя вядома тэатральнай публіцы па шэрагу пастановак – ён драматург-наватар. Вялікую ўвагу Ігар Сідарук удзяляе творчасці для дзяцей: яго мастацкія характары маюць непаўторнае аблічча. П’есы аўтара сваімі мастацкімі і этычнымі вартасцямі нават заслужылі месца ў школьнай праграме.

Сёння сярод кобрынчан Ігар Фёдаравіч добра вядомы не толькі сваімі літаратурнымі творамі, але і тым, што цягам апошніх гадоў актыўна займаецца фатаграфіяй.

Паказальнік мае наступную структуру:

**Прадмова**

**Сідарук І.: «І раптам успомніць, азір нуцца…»**: напярэдадні юбілея

**Жыццёвы прынцып: «Рабіць тое, што я хачу, і што падабаецца»**: біяграфічны артыкул

**Драматург, паэт, празаік**

**Бібліяграфічныя матэрыялы**

***Творы І. Сідарука***. Гэты раздзел уключае кнігі аўтара, публікацыі твораў у зборніках, часопісах і

газетах на беларускай, рускай мовах за 1989-2024 гады. Матэрыял згрупаваны наступным чынам: кнігі - у алфавіце назваў, артыкулы - у зваротна-храналагічным парадку, унутры года – у алфавіце аўтараў, загалоўкаў.

***Аб жыцці і творчасці І. Сідарука***. Раздзел складаецца з артыкулаў з кніг, зборнікаў, часопісаў і газет на беларускай і рускай мовах за 1992-2024 гады.

Мова бібліяграфічных апісанняў адпавядае мове выданняў. Для раскрыцця зместу пры неабходнасці да запісаў даюцца кароткія даведачныя анатацыі. Анатацыі прыведзены на мове анатаванага дакумента.

Даведачна-дапаможны апарат выдання ўключае спіс перыядычных выданняў, матэрыялы з якіх уключаны ў біябібліяграфічны даведнік.

Выданне ўключае фотаздымкі з архіва літаратара Ігара Сідарука і фотагалерэі Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі.

# ІГАР СІДАРУК

## «І раптам успомніць, азірнуцца...»:

### *напярэдадні 50-гадовага юбілея*



Як звычайна пачынаюць пісаць аўтабіяграфіі?

Нарадзіўся там-та і там-та, скончыў то-та і то-та, працаваў тым-та і тым-та. Не будзем парушаць традыцыі?

Толькі ці шмат будзе цікавым некаму, што 23 ліпеня 1964 года ў невялічкім горадзе Брэсцкай вобласці Кобрыне ў звычайнай сям'і нарадзіўся звычайны хлопчык? Які да школы выхоўваўся ў вёсцы, у бабулі Ганны і дзеда Івана, і на магілах якіх, калі выпадае хвіліна там бываць, я плачу сапраўднымі слязьмі і ў свае 50 год?

Ці будзе цікавым тое, што аднымі з першых сваіх слоў я вывучыў мацерныя прыпеўкі ад суседняга вясковага п'яніцы Грышы, аднак па 100 разоў прасіў бабулю перачытаць першыя свае кніжкі «Калабок» і «Рэпку», якія знайшліся на пыльным гарышчы?

А потым была школа № 1 у тым жа Кобрыне (1971-1981) і, пасля яе - філфак Белдзяржуніверсітэту імя Леніна ў Мінску (1981-1986). Рускае аддзяленне, паколькі на той час я ўжо марыў стаць знакамітым рускім пісьменнікам.

Беларускасць прыдзе (вернецца?.. абудзеца?..) потым, нашмат потым. Праўда, знакамітым ні рускім, ні беларускім пісьменнікам я так і не стаў. Па шчырасці, ніколі асабліва і не імкнуўся. Пісаў-ствараў вершы, драмы, прозу - паколькі мне проста гэтак хацелася. Што абсалютна супадае з адным з найпершых маіх жыццёвых прынцыпаў: рабіць толькі тое, што падабаецца, і ад чаго, як гаворыцца, я проста «цягнуся».

Цягнуўся ад літаратуры - быў амаль увесь у ёй, жыў і дыхаў ёю (ужо выбачайце за банальныя штампы!). Выпаў лёс акунуцца ў журналістыку - і вось ужо артыкулы, рэпартажы, нарысы, безліч самых розных допісаў і ў раённым «Кобрынскім весніку», і ў «Брестском курьере», і ў многіх іншых выданнях.

Захацелася выпрабаваць сябе ў гандлі - пайшоў на базар і пачаў гандляваць CD, DVD-дыскамі. Потым «пераехаў» са сваім гандлем у Інтэрнэт - і вось ужо мая крама вядомая ледзь не на ўвесь свет…

Калі ж у рукі трапіў фотаапарат… Яшчэ адно жыццёвае захапленне, гэтым разам - цяперашняга дня, цяперашняга майго існавання.



Што яшчэ было, што яшчэ пакінуў на гэтай зямлі? Некалькі кніжак паэзіі і прозы, каля двух дзясяткаў пастаўленых п'есаў, у асноўным, у тэатрах лялек, некалькі соцень добрых і цёплых фота, якія разышліся па сямейных і вясельных альбомах, па кампьютэрных тэчках…

Як ні «дзіўна», хутка будзе 30 год, як, пабраўшыся шлюбам, жывем разам з прыгожай і цудоўнай жанчынай Аксанай, гадуючы (ці ўжо шчасліва выгадаваўшы?!.) дзвюх выдатных дачок: Дар'ю і Яну. Якія таксама вырашылі звязаць свой «лёс» з філалогіяй, праўда, жыццё можа быць унясе ў іхнія планы-клопаты свае карэктывы.

Ну вось, за плячыма пяць дзясяткаў, а жыццяпіс можна ўмясціць амаль на адну старонку. Гэта калі коратка, апускаючы многія падрабязнасці.

Адзінае, што варта дадаць у канцы. Акрамя прынцыпа «*Рабіць тое, што я хачу, і што падабаецца»*, ёсць, выпрацаваліся, выкрышталізаваліся яшчэ некалькі жыццёвых прынцыпаў:

►*Ніколі не шкадаваць аб тым, што зроблена.*

►*Заўсёды ўсміхацца: людзям, дзецям, небу, нават самому сабе.*

*►Берагчы здароўе і сваю сям'ю - як аснову асноў.*

*►Верыць толькі ў лепшае.*

*►Нічога не ўспрымаць сур'ёзна. Увогуле, ніколі.*

*►На гэтым свеце ёсць толькі дзве рэчы, вартыя ўвагі: жыццё і смерць. Усё іншае - не вартае і зломанага шэлега…*

***З павагай да Вас, Ігар Сідарук***
*17.07.2014*
*г. Кобрын*



# ЖЫЦЦЁВЫ ПРЫНЦЫП: «Рабіць тое, што я хачу, і што падабаецца»

Ігар Фёдаравіч Сідарук нарадзіўся 23 ліпеня 1964 года ў г. Кобрыне Брэсцкай вобласці. Бацька, Фёдар Іванавіч, сам з сялянскай сям'і, яшчэ ў маладосці пераехаў у г. Кобрын, дзе ўладкаваўся на аўтарамонтны завод (цяперашняе прадпрыемства ААТ «Салеа-Кобрын»), дзе прайшоў шлях ад простага рабочага да вышэйшых кіраўнічых пасад.

Маці Феафанія Васільеўна, таксама з сялянскай сям'і, працавала на гэтым жа прадпрыемстве, была, як тады гаварылі і пісалі, у перадавіках.



***Сям'я Ігара Сідарука (Ігару – 5 год)***



*З малодшым братам*

Вучыўся Ігар у сярэдняй школе № 1 г. Кобрына, выпускнік 1981 года.

Пасля заканчэння школы паступіў на філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя У. І. Леніна, які скончыў у 1986 годзе.

Цікавы факт: будучы студэнтам, Ігар Сідарук пісаў сцэнарыі да перадачы «Калыханка», і ў выніку 5-20% перадач штомесячна на працягу некалькіх гадоў выходзілі па яго сцэнарыях.



***У паходзе 5 курс філфак БДУ***




***Студэнцкі тэатр***

Паспрабаваў сябе ў розных сферах: ад ліцейшчыка гарачага металу да настаўніка, карэспандэнта незалежнай і дзяржаўнай прэсы.



Некаторы час пасля размеркавання настаўнічаў на Салігоршчыне.

З 1988 года па 1992 год працаваў у газетах «Кобрынскі веснік», «Брестский курьер».

Вельмі плённы перыяд – цэлае стагоддзе, з 1990 года па 2000 год, прайшло на пасадзе загадчыка літаратурнай часткі ў Брэсцкім абласным тэатры лялек.



З сярэдзіны 2002 года па канец 2006 года займаўся прадпрымальніцкай дзейнасцю.

Ігар Сідарук - член і адзін са стваральнікаў літаратурнага аб'яднання «Таварыства Вольных Літаратараў».

Чарговае вяртанне ў літаратуру пачалося з лірычных вершаў (часопіс «Дзеяслоў», № 29, 2007) і падлеткава-рамантычнай кнігі «Клубнічная кепачка ў снежную ноч», якая, на жаль, так і не пабачыла свет.

З 2012 года Ігар Сідарук актыўна займаецца фатаграфіяй, аддаючы перавагу творчым праектам. У маі 2014 года з поспехам прайшла яго выстава, прымеркаваная да Міжнароднага дня сям'і, пад назвай «Імгненні сямейнага шчасця».




Вось што кажа сам Ігар Сідарук: «*Мая цікавасць да фота ўзнікла, можна сказаць, выпадкова. На момант вяртання на працу ў «Кобрынскі веснік» была свабоднай стаўка фота-карэспандэнта.*

*Прыйшлося пагадзіцца. І вось так, у ходзе працоўных фотаздымак, уцягнуўся ў працэс, стаў жыва цікавіцца ўсім, што звязана з фатаграфіяй. З часам стаў разумець і адчуваць, якія тэмы мне бліжэй усяго, у чым я найбольш адкрываюся як асоба і як аўтар».*

*«А сёння бліжэй за ўсё такія праекты, дзе можна спалучыць і нейкія драматургічныя моманты, і фатаграфічныя прыёмы. Дзе ёсць прастора для залучэння гледача для роздуму, суперажывання, а таксама атарскай пазіцыі, востра акрэсленай сучаснай ідэі. Іншым разам падобныя рэчы «выстрэльваюць», іншым разам гэта можна лічыць чарговым творчым эксперыментам. І гэта, на мой погляд, нармальна. Мастак не можа за кожным разам ствараць геніяльныя рэчы, бываюць і «не надта геніяльныя» (смяецца)», - працягвае Ігар Фёдаравіч.*





***У дзень 60-годдзя, 23 ліпеня 2024***

# ДРАМАТУРГ, ПАЭТ, ПРАЗАІК



У літаратуры Ігар Сідарук вядомы як паэт, празаік і драматург. Піша для дзяцей.

Першыя літаратурныя вопыты Ігара Сідарука друкаваліся ў выданнях «Студенческий меридиан», «Маладосць», «Чырвоная змена», «Дзень паэзіі - 90».

У 1992 годзе ў калектыўным зборніку «Драўляны рыцар» была апублікавана яго п’еса для дзяцей «Кветкі пад ліўнем».

Ігар Сідарук - аўтар паэтычных зборнікаў «Чарнабел» (1991), «Саната Арганата» (1994), «Моўкнасць» (1997), «Непазьбежны лістапад» (2019), зборніка прозы «Квадратная варона», кнігі для дзяцей «Павучальныя гісторыі дзядзечкі Сіда Рука» і каля 20 п'ес, пераважна дзіцячых.




Яго творы друкаваліся як у беларускіх, так і ў некаторых замежных выданнях.

Васілій Васільевіч Кандрасюк, кампазітар з Брэста, загадчык музычнай часткі Брэсцкага тэатра драмы і музыкі, паклаў на музыку вершы Ігара Сідарука «Нечаканая» і «Спакусы».

Асноўны накірунак літаратурнай творчасці Ігара Сідарука – драматургія.




Яго пяру належаць п'есы «Галава», «Прыгоды Люстрынкі, ці несусветнае зладзейства», «Янка Зух і нячысты дух», «Штукары», «Збавіцель», «Плач, саксафон».

Пра «Галаву» Ігара Сідарука знаўцы тэатра і драматургіі гавораць «*як пра рэч эксперыментальную, наватарскую... Гэта тое, чаго мы дасюль не сустракалі ў беларускай драматургіі*» (Бельскі, А. Пуцявінамі абнаўлення: Маладая беларуская драматургія 80-х – пач. 90-х гг. / А. Бельскі // Роднае слова. 1994. № 1. С. 28-30).

Праз сімвалічныя вобразы Галавы, Шукальніка, Дурня, Сіроткі, Бежанкі аўтар выказаў свой погляд на нашу рэчаіснасць і яе праблемы. Зрабіў гэта нестандартна, адышоў ад звыклай вобразна-кампазіцыйнай сістэмы, што і дало падставу даследчыкам лічыць п’есу «Галава» фарс-абсурдам.

Найбольш вядомая п'еса Ігара Сідарука «Галава» пабачыла свет у маі 1992 года на сцэне Тэатра нацыянальнай драматургіі «Вольная сцэна» ў пастаноўцы вядомага беларускага рэжысёра Валерыя Мазынскага.



***Прем’ера пьесы «Галава»***
***май 1992***



***Сцэна з п’есы «Галава»***

У 1995 годзе была пастаўлена меладрама «Плач, саксафон!»

За п'есу «Збавіцель» аўтар атрымаў узнагароду на фестывалі творчай моладзі тэатраў драмы і лялек у Гродне. П’еса прызнана лепшай аўтарскай работай.

Ігар Сідарук – уладальнік Гран-пры міжнароднага тэатральнага фестывалю «Белая вежа» ў Брэсце (2001) за спектакль «Залатая табакерка».

Асобную, змястоўную старонку творчасці Ігара Сідарука складае дзіцячая драматургія. Найбольш пашыраным у ёй з’яўляецца жанр драматычнай п’есы-казкі. «*І тут аўтар здолеў сказаць самабытнае слова. Яго мастацкія характары маюць непаўторнае аблічча, а для канфліктаў ён знаходзіць арыгінальныя падзейныя кантэксты*» (Трафімчык, А. Драматургія для дзяцей : Ігар Сідарук : Да 45-годдзя пісьменніка / Анатоль Трафімчык // Жырандоля-2: літаратурны альманах Брэсцкага абласнога аддзялення Саюза беларускіх пісьменнікаў. Мінск, 2009. С. 221).

У Ігара Сідарука ў гэтым плане варта адзначыць драматычную казку «Кветкі пад ліўнем». Клапатлівы Садоўнік вырошчвае розныя кветкі - Цюльпаны, Званочкі, Гладыёлусы і інш. Ён баіцца параніць іх неасцярожным словам ці дотыкам, і кветкі, надзеленыя пэўнымі чалавечымі рысамі, адгукаюцца на дабрыню, перажываюць, весяляцца і нават разважаюць. Так, без павучэнняў, аўтар даводзіць

маленькаму чытачу, як трэба жыць, паводзіць сябе ў вялікім свеце.




Ігар Сідарук - аўтар кнігі для дзяцей «Павучальныя гісторыі дзядзечкі Сіда Рука» (1994), зборніка п'ес «Віртуальнае зубраня» (Мінск, 2004).




П’есы Ігара Сідарука сваімі мастацкімі і этычнымі вартасцямі заслужылі месца ў школьнай праграме.

У тэатрах лялек Беларусі пастаўлены яго «Меч Анёла» (1993), «Янка - зух і нячысты дух» (1993), «Завадныя парасяткі» (1994), «Збавіцель» (1994), «Штукары» (1994).

Напярэдадні 60-годдзя, Ігар Сідарук напісаў нізку новых аповедаў, частка з якіх друкавалася ў часопісе «Дзеяслоў», кнігі вершаў «Ваўкалак» і «Трохрадкоўі», якія пакуль чакаюць свайго выдаўца

# Бібліяграфічныя матэрыялы

## *Творы І. Сідарука*



















**Сідарук, І.** [Вершы] / Ігар Сідарук // Жарсць каханьня : лірыка паэтаў Берасьцейшчыны пра каханьне / укл. С. Амяльчук. - Брэсцкая друкарня, 2016. - С. 16, 18, 55, 64, 80.

**Сідарук, І.** Вершы / Ігар Сідарук // Дзень паэзіі – 91. - Мінск, 1991. - С. 150.

**Сідарук, І.** Выкраданне выпрука : аповеды / Ігар Сідарук. – Мінск, ТАА "Электронная кнігарня", 2017. – 240 с.

**Сідарук, І.** «Забыць усіх, пайсці, замкнуцца…» : вершы / Ігар Сідарук // Дзень паэзіі – 90. - Мінск, 1990. - С. 138.

**Сідарук, І.** Галава : п'еса / Ігар Сідарук // Сучасная беларуская п'еса. - Мінск, 1997. - С. 221-247.

**Сідарук, І.** Затурханыя: урывак з п'есы / Ігар Сідарук // Ксеракс Беларускі. - Полацк, 1992. - С.15-21.

**Сідарук, І.** Квадратная варона : аповеды / Ігар Сідарук. – Полацк-Горадня-Кобрынь, 2000. – 119 с.

**Сідарук, І.** Кветка для Анёла / І. Сідарук // Кветка для Анёла : зборнік п'ес для аматараў драматычных і лялечных тэатраў / уклад. Г. Каржанеўская. - Мінск, 2003.

**Сідарук, І.** Кветкі пад ліўнем : п'еса-казка // Драўляны рыцар : рэпертуарны зборнік / уклад. Н. Загорская ; маст. М. Круглікава. – Мінск,1992. – С. 246-269.

**Сідарук, І.** Моўкнасць : вершы / Ігар Сідарук. – Брэст, 1997. - 36 с.

**Сідарук, І.** Непазьбежны лістапад : вершы / Ігар Сідарук. – Полацк : Выдавецкая ініцыятыва «Подацкае ляда», 2019. – 76 с.

**Сідарук, І.** Павучальная гісторыя дзядзечкі Сідарука / Ігар Сідарук. – Брэст : Талер, 1994. – 23 с.

**Сідарук, І.** Подых звера / Ігар Сідарук // Дзядзінец. Паэзія Берасцейшчыны : літаратурна-мастацкае выданне. - Брэст, 1999. - С. 268-277.

**Сидорук, И.** Стихи / Игорь Сидорук // Белой Вежы свет : поэзия Брестчины в переводах Валерия Гришковца. - Брэст, 2010. - С.140-142.

**Сидорук, И.** Стихи / Игорь Сидорук // Белой Вежы свет : поэзия Брестчины в переводах Валерия Гришковца. - Брэст, 2005. - С. 139-140.

**Сідарук, І.** Торба : п’еса / Ігар Сідарук // Ксеракс Беларускі. - Полацк, 1993. - С. 34-40.

**Сідарук, І.** Чарнабел : вершы / Ігар Сідарук. – Кобрынь,1991 – 32 с.

**Сідарук, І. Х.** Кантракт : нітка аповедаў / Ігар Сідарук // Дзеяслоў. - 2022. — № 2 (сакавік-красавік). — С. 77-96.

Змест: Вушы ; Цвік у вока ; Іголка ; Кантракт ; Яны яшчэ цяўкаюць.

**Сідарук, І. Х.** «Якой ты музыкай гучала! ... » : [верш] / Ігар Сідарук // Заря. - 2020. — 23 мая (№ 42). — С. 14.

**Сідарук, І.** «Калі твой голас не пачую ...»; «Ты размаўляй са мною моўчкі ...»; «Грай без нот, сляпы музыка ...»; «Апошнім усплёскам ...» / Ігар Сідарук // Літаратура і мастацтва. - 2019. - 25 кастрычніка (№ 42). — С. 8.

**Сідарук, І.** «Мне сёння сніўся белы воўк ... » : верш / Ігар Сідарук // Заря. - 2019. - 28 сент. - С. 14.

**Сідарук, І.** «Табой я невылечна хворы ... » : верш / Ігар Сідарук // Заря. - 2019. — 20 июля. — С. 16.

**Сідарук, І.** «Чаканне — токам ...» : верш / Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. - 2019. - 4 верасня. - С. 8.

**Сідарук, І.** «А ведаеш, будзе сумна.. ».; «Ты не ў мінулым, не» : вершы / Ігар Сідарук // Заря. - 2018. — 15 декабря. — С. 14.

**Сідарук, І.** [А я скрозь дрэвы так глядзеў упарта!..] : верш / Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. - 2018. — 14 лютага. — С. 10.

**Сідарук, І.** [Вершы] / Ігар Сідарук // Заря. - 2018. — 1 сентября. — С. 9.

**Сідарук, І.** [Вершы] / Ігар Сідарук // Заря. - 2018. — 24 мая. — С. 19.

**Сідарук, І.** [Вершы] / Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. - 2018. — 14 лютага. — С. 8.

**Сідарук, І**. «Праз сотні кіламетраў, ветраў, дзён» : верш / Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. - 2018. — 17 кастрычніка. — С. 8.

**Сідарук, І.** «...Сумаваць па мне — будзеш?» : [верш] / Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. - 2018. — 21 красавіка. — С. 17.

**Сідарук, І.** У срэбным тумане няскончанай казкі / Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. - 2018. - 20 чэрвеня. - С. 8.

**Сідарук, І.** [Вершы] / Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. - 2017. — 4 кастрычніка. — С. 8.

**Сідарук, І.** [Вершы] / Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. - 2017. — 6 мая. — С. 16.

**Сідарук, І.** [Вершы] / Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. - 2017. — 4 сакавіка. — С. 7.

**Сідарук, І.** Мы збіралі з табою кветкі ... / Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. - 2017. — 2 жніўня. — С. 8.

**Сідарук, І.** [Вершы] / І. Сідарук // Кобрынскі веснік. - 2016. — 16 лістапада. — С. 8.

**Сідарук, І.** Мой ціхі саапернік, маўклівы раўнівец мой : аповед / Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. - 2015. — 24 кастрычніка. — С. 9.

**Сідарук, І.** Сэрцу хочацца, каб яго цалавалі / Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. - 2015.— 20 чэрвеня. — С. 10.

**Сідарук, І. Х**. Твой доўгі шалік... : [верш] / Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. - 2015. — 15 красавіка. — С. 8.

**Сідарук, І.** У гэтым шалі і бяздонні : [вершы] / Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. - 2015. - 8 мая. - С. 10.

**Сідарук, І.** У дзень несамотны / Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. - 2015. — 1 жніўня. — С. 4.

**Сідарук, І.** Веснавыя загадкі / Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. - 2013. — 25 мая. — С. 10.

**Сідарук, І.** Лірычныя абразкі / Ігар Сідарук // Літаратура і мастацтва. - 2013. - 18 студзеня. – С. 7.

**Сідарук, І.** Сем белых хрызантэм: апавяданне / Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. - 2013. - 13 верасня. - С. 9.

**Сідарук, І.** Я цябе правяду, нібы восень… : вершы / Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. - 2013. – 9 лютага. - С. 10.

**Сідарук, І.** Букет з сюрпрызам : гумарэска / Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. - 2012. - 7 сакавіка. - С. 4.

**Сідарук, І.** Вачэй - не бачыць. Рук не цалаваць : вершы / Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. - 2012. – 21 красавіка. - С. 10.

**Сідарук, І.** Верш / Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. - 2012. - 29 верасня. – С. 9.

**Сідарук, І**. Ветэран / Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. - 2012. - 30 чэрвеня. - С. 9.

**Сідарук, І.** Галоўны сакрэт Патапыча : казка, скарагаворкі для дзяцей / Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. - 2012. - 1 студзеня. - С. 9.

**Сідарук, І.** Зноўку восень : верш / Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. - 2012. - 10 лістапада. - С. 12.

**Сідарук, І.** Пасля кропкі працяжнік не ставіцца : абразкі / Ігар Сідарук // Літаратура і мастацтва. - 2012. - 9 сакавіка. - С. 17.

**Сідарук, І.** Перадсвяточны затор : гумарэска / Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. - 2012. - 1 студзеня. - С. 4.

**Сідарук, І.** Як Бонік і Кныш акунёў лавілі : казка / Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. - 2012. - 19 мая. – С. 10.

**Сідарук, І**. Як казляня сябра шукала / Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. - 2012. - 18 лютага. – С. 9.

**Сідарук, І**. Як Кныш ленаваўся / Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. - 2012. - 25 жніўня. - С. 9.

**Сідарук, І.** Вершы / Ігар Сідарук // Заря. - 2011. - 27 октября. – С.18.

**Сідарук, І.** Вершы / Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. - 2011. – 3 верасня. – С. 9.

**Сідарук, І.** Зноў непазбежны лістапад : верш / Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. - 2011. - 23 ліпеня. – С. 10.

**Сідарук, І.** Казка для бабулі / Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. - 2011. - 22 кастрычніка. - С. 10.

**Сідарук, І.** Пачатак восені : вершы / Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. - 2011. - 15 кастрычніка. - С. 10.

**Сідарук, І.** Прыйшла, каб пайсці : мініяцюра / Ігар Сідарук // Заря. - 2011. - 24 ноября. - С. 19.

**Сідарук, І.** Шолах лісця... : верш / Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. - 2011. - 3 снежня. – С. 10.

**Сідарук, І**. «Я кахаю цябе!» / Ігар Сідарук // Заря. - 2011. - 29 сентября. - С. 18.

**Сідарук, І.** Кепачка : апавяданне / Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. - 2010. - 20 кастрычніка. - С. 4.

**Сідарук, І.** Асыпаецца ўсё. Нават лета / Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. - 2009. - 21 лютага. – С. 8.

**Сідарук, І**. Загадка непаўторнасці / Ігар Сідарук // Народная трыбуна. - 2009. - 1 жніўня. - С. 11.

**Сідарук, І.** І толькі гаркавы рамонкавы пах... / Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. - 2009. - 19 жніўня. – С. 8.

**Сідарук, І.** Салодкіх вуснаў сьпелае віно...: вершы / Ігар Сідарук // Дзеяслоў. - 2009. - № 3. – С. 84-88.

**Сідарук, І.** Усё далей і далей ад твайго дома / Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. - 2009. - 9 снежня. – С. 8.

**Сідарук, І.** Хто кранаецца плячэй у бяссонне?.. / Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. - 2009. - 9 верасня. - С. 8.

**Сідарук, І.** Вершы / Ігар Сідарук // Народная трыбуна. – 2008. – 28 чэрвеня. – С. 11.

**Сідарук, І.** Вершы / Ігар Сідарук // Народная трыбуна. – 2008. – 26 красавіка. – С. 11.

**Сідарук, І.** Вершы / Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. – 2007. – 10 студзеня. – С. 8.

**Сідарук, І.** Незгарэлых растанняў лістота : літаратурная старонка «Узлёт» / Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. - 2007. - 19 апреля. - С. 6.

**Сідарук, І.** Шолах зорак адзіноты : вершы / Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. - 2007. - 10 студзеня. – С. 8.

**Сидорук, И.** Всех позабыть. Уйти. Замкнуться ; Улыбка. Вечер / Игорь Сидорук // Неман. – 2005. - № 9. – С. 154.

**Сідарук, І.** Вершы / Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. – 2003. – 11 студзеня. – С. 7.

**Сідарук, І.** Дзіцячы куточак / Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. – 2002. – 27 лютага. – С. 3.

**Сідарук, І.** Затачэнец : апавястушка – фантасмагорыйка / Ігар Сідарук // Правінцыя. - 2002. - № 3- 4. - С. 49-62.

**Сідарук, І.** Чыкануты / Ігар Сідарук // Правінцыя. - 2002. - № 3- 4. - С. 59-62.

**Сідарук, І.** Яна проста прыедзе. І усё... : вершы / Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. - 1999. - 10 лістапада. - С. 3.

**Сідарук, І.** Нагавіцы клятчастае масьці / Ігар Сідарук // Радавод. - 1998. - № 3.- С. 108-111.

**Сідарук, І.** Нечаканае : верш І. Сідарука, муз. В. Кандрасюка. Прэм’ера песні // Звязда. - 1998. - 21 сакавіка. - С. 4.

**Сідарук, І.** Псяюга : апавяданне / Ігар Сідарук // Культура. – 1996. - 10-16 снежня. - С. 11.

**Сідарук, І.** Моўкнасць : вершы з новай кнігі / Ігар Сідарук // Культура. – 1996. - 7-13 мая (№18) - С. 6-7.

**Сідарук, І.** Квадратная варона : раман / Ігар Сідарук // Культура. – 1995. - 26 красавіка.- С. 6-7.

**Сідарук, І**. Маленькі чалавечак : апавяданне / Ігар Сідарук // Культура. - 1995. - 4-10 кастрычніка. – С. 7.

**Сідарук, І.** На апошняй старонцы лета : вершы / Ігар Сідарук // Маладосць. – 1995. - № 8. - С. 92-94.

**Сідарук, І.** Кветка скаутаў – лілея : верш / Ігар Сідарук // Дзеці і мы. – 1994. - № 11 - С. 4.

**Сідарук, І.** Трохрадкоў / Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. – 1994. - 3 жніўня. - С. 3.

**Сідарук, І.** Лірычныя вершы / Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. – 1993. - 31 сакавіка. - С. 3.

**Сідарук, І.** Вершы / Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. – 1992. - 28 лістапада. - С. 3.

**Сідарук, І.** Вершы / Ігар Сідарук // Чырвоная змена. – 1992. - 12-18 кастрычніка. - С. 10.

**Сідарук, І.** Вершы / Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. – 1992. - 29 жніўня. - С. 3.

**Сідарук, І.** Вершы / Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. – 1992. - 13 мая. - С. 3.

**Сідарук, І**. Смачны суп : вершы / Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. – 1992. - 28 лістапада. - С. 3.

**Сідарук, І.** Вершы / Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. – 1991. - 19 лістапада. - С. 3.

**Сідарук, І.** Вершы / Ігар Сідарук // Маладосць. – 1991. - № 11. - С. 2-4.

**Сідарук, І.** Памяць : верш / Ігар Сідарук // Камуністычная праца. – 1989. - 5 жніўня.

## *Аб жыцці і творчасці І. Сідарука*

**Сідарук Ігар Хведаравіч** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. - Мінск, 2002. - Т. 14. – С. 369.

**Сідарук Ігар** // Беларускія пісьменнікі : біябібліяграфічны слоўнік : у 6 т. - Мінск, 1995. - Т. 6. – С. 667.

**Ігар Сідарук** // Літаратурная карта Берасцейшчыны. - Брэст, 2008. - С. 315-316.

**...И вдруг** слова стихами закружились : [литературный сборник / В. Клочкович и др. ; сост. и автор предисловия З. А. Ничик] ; ДУК "Брэсцкі абласны грамадска-культурны цэнтр". - Брест, 2014. - 80 с.

Среди авторов - И. Сидорук.

**Кавалюк, А. С.** Берасцейская п'еса для дзяцей і моладзі ў кантэксце нацыянальнай літаратурнай традыцыі / А. С. Кавалюк // Нацыянальна-культурны кампанент у літаратурнай і дыялектнай мове : зборнік навуковых артыкулаў. — Брэст, 2020. — С. 93—98.

**Лялькі,** маскі, твары...: зборнік матэрыялаў канферэнцыі "Сучасны тэатр лялек Беларусі" (Мінск, 27 кастрычніка 1997 года) / рэдактар Галіна Алісейчык. - Мінск : Арты-Фэкс, 1998. - 111, [1] с.

Гл. на с. 12, 87, 104, 105.

**Ляшук, В. Я**. Вывучэнне аглядавых тэмаў па беларускай літаратуры / аўтары-складальнікі: В. Я. Ляшук, Г. М. Снітко. — Мінск : Юніпрэс, 2001. – 239 с. - (Для школьнікаў і абітурыентаў).

Гл. на с. 25, 26.

**Ляшук, В. Я.** Літаратурная Берасцейшчына : краязнаўчыя нарысы, партрэты, артыкулы / В. Я. Ляшук, Г. М. Снітко. - Мінск, 2008. – 320 с. : іл.

Гл. на с. 15, 270, 300-301.

**Ляшук, В. Я.** Літаратура Берасцейшчыны / В. Я. Ляшук, Г. М. Снітко. - Брэст, 1999. – 373 с.

Гл. на с. 364-366.

**Сідарук Ігар Фёдаравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 441.

**Сільнова, Л. Д.** Мара нябесная; Калядная казка : [вершы] / Людка Сільнова // Зеленавокія воі і іх прыгажуні : вершы з прысвячэннямі / Людка Сільнова. — Мінск, 2001.

Вершы з прысвячэннямі Ігару Сідаруку — гл. на с. 10, 14—15, 25, 45, 52.

**Трафімчык, А.** Драматургія для дзяцей : Ігар Сідарук : да 45-годдзя пісьменніка / Анатоль Трафімчык // Жырандоля-2 : літаратурны альманах. - Мінск, 2009. - С. 221-228.

**Знакамітыя** выпускнікі школы. **Сідарук Ігар Фёдаравіч** // Самая «першая» : інфармацыйна-бібліяграфічнае выданне да 110-годдзя з часу заснавання ўстановы адукацыі «Сярэдняя школа № 1 г. Кобрына» / Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук. - Кобрын, 2020. – С. 31-32.

**Ігар Сідарук.** «Іншым разам радок дыктуе само неба…» : біябібліяграфічны паказальнік / УК «Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка», аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. С. Д. Курачук. – Кобрын, 2014. - 32 с.

**Ігар Сідарук** : рэкамендацыйны бібліяграфічны спіс / Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; складальнік Святлана Курачук. - Кобрын, 2002. - 4 с.

**Календарь** памятных дат и событий. 23 июля : в этот день родились // Беларусь сегодня (СБ). – 2024. – 23 июля (№ 141). – С. 16 : фот.

1964 г. Игорь Сидорук, белорусский писатель.

**Караткевіч, В. І.** Монстр як увасабленне "інакшасці" (на прыкладзе твораў беларускай драматургіі канца XX ст.) / Вячаслаў Іванавіч Караткевіч // Веснік Брэсцкага ўніверсітэта. — 2021. — № 1. — С. 85—90.

Разглядаецца спецыфіка ўвасаблення вобраза монстра як феномена сучаснай культуры на прыкладзе беларускай драматургіі канца XX ст., асаблівая ўвага надаецца творам І. Сідарука.

**Календарь** памятных дат и событий. 23 июля // Советская Белоруссия. – 2019. – 23 июля. – С. 16.

В это день родился уроженец г. Кобрина писатель И. Сидорук.

**Сідарук, І**. Творчасць - справа інтымная / Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. - 2015. — 7 сакавіка. — С.10.

Роздумы аўтара аб творчасці.

**Трафімчык, А. В.** Мастацкасць і добразычлівасць : сучасная беларуская літаратурная казка (на прыкладзе п'ес для дзяцей) / Анатоль Трафімчык // Белая Вежа. — 2015. — № 10. — С. 12—24.

**Галава, А.** Сваёй прысутнасцю мне шчасце падары… / Адам Галава // Краязнаўчая газета. - 2014. - № 20 (май). - С. 5.

Прайшла выстаўка фотамастака І. Сідарука "Імгненні сямейнага шчасця".

**Славін, В.** У адну непарушную повязь / Віктар Славін // Народная трыбуна. - 2014. - 16 мая.- С. 2.

У памяшканні ЗАГСа арганізавана выстава фотамастака І. Сідарука, прымеркаваная да Дня сям'і.

**Сідарук, І.** Магнетызм друкаванага слова / Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. - 2012. - 18 лютага.

Кніга ў жыцці І. Сідарука.

**Трафімчык, А.** Дабро VS Зло / Анатоль Трафімчык // ЛіМ. - 2012. - 20 ліпеня. - С. 6.

Дзіцячы драматург І. Сідарук.

**Трафімчык, А**. Дзіцячыя дзеі Ігара Сідарука / А. Трафімчык // Роднае слова. – 2014. - № 7. – С. 23-25.

**Драбеня, Ф.** Сучасная беларуская дзіцячая драматургія : сюжэты, матывы, вобразы / Ф. Драбеня // Полымя. - 2008. - № 11. - С. 112.

**Зенава, Г**. Эвалюцыя жанру апавядання ў працэсе мастацкага асэнсавання рэчаіснасці канца XX ст. : літартурная крытыка // Роднае слова. - 2008. – № 1. - С.17-21.

**Сідарук, І.** “Іншым разам радок дыктуе само неба…” / Ігар Сідарук ; [гутарыла] Ганна Каравайчык // Кобрынскі веснік. - 2008. - 6 жніўня. - С. 6.

Ігар Сідарук адзначыў 25-годдзе творчай дзейнасці.

**Лявонава, Е.** Беларуская літаратура ў Аўстрыі / Ева Лявонава // ЛіМ. - 2007. - 13 красавіка.

У аўстрыйскім часопісе прадстаўлена беларуская літаратура апошніх дзвух дзесяцігоддзяў, у т. л. творы кабрынчаніна Ігара Сідарука.

**Сівец, Ю.** Спынены гадзіннік і чаканне вечнасці / І. Сівец // ЛіМ. — 2007. - 15 чэрвеня. – С. 20.

Аб тэатры абсурду на Беларусі, узгадваецца творчасць Ігара Сідарука.

**Шылец, А. М.** Ідэйна-эстэтычныя пошукі сучаснай беларускай паэзіі ў галіне мастацкага міфалагізму : у т. л. І. Сідарук / А. М. Шылец // Весці Нацыянальнай Акадэміі Навук Беларусі. - 2007. – № 2. - С. 108-114.

**Кісліцына, Г.** Мадыфікацыя празаічных жанраў у сучаснай беларускай літаратуры : [у тым ліку аб творах І. Сідарука] / Ганна Кісліцына // Роднае слова. - 2006. - № 9. - С. 23-25.

**Пашкевіч, А.** Літаратура, як нацыянальная ідэя : даклад старшыні ГА "Саюза беларускіх пісьменнікаў" А. Пашкевіча, прачытаны на чарговым 25 справаздачна-выбарчым з'езде 22 кастрычніка 2006 г. // Наша слова. — 2006. - 27 снежня. - С. 6-7.

Узгадваецца І. Сідарук.

**Пацюпа, Ю.** Постмадэрнізм, калыска мая : [літаратурна-крытычныя артыкулы] / Ю. Пацюпа // ARCHE. — 2004. - № 3. - С. 249-279.

Узгадваецца І. Сідарук.

**Кісліцына, Г.** Апошні цвік / Ганна Кісліцына // Літаратура і мастацтва. - 2001. - 6 красавіка. - С. 6.

Аб п’есе І. Сідарука “Квадратная варона”.

**Знаёмцеся**: Ігар Сідарук, драматург // Культура. - 2000. - 17-24 чэрвеня. - С. 7 : фот.

**Сидорук, И.** В мире детства - чисто и удивительно... / Игорь Сидорук // Заря. — 2000. - 18 апреля.

О спектакле "Питер Пен" областного театра кукол.

**Шавель, М.** “Я ведаю, куды плыве наш карабель” / М. Шавель // Культура. - 2000. - 26 жніўня (№ 34). - 1 верасня. - С. 7.

Брэсцкі абласны тэатр лялек атрымаў грант Фонд Сораса за пастаноўку “Дрэва багоў” паводле Ігара Сідарука.

**Сидорук, И.** Али-Баба, Питер Пэн и лепестки белой вишни / Игорь Сидорук // Заря. — 1999. – 11 ноября.

О репертуаре областного театра кукол.

**Зелка, К.** Казачны балаган на Каляды / К. Зелка // Брестский курьер. — 1998. - 10 декабря. - С. 14.

Пра навагоднюю праграму абласнога тэатра лялек.

**Шалахоўскі, А.** Чым жыве творчая моладзь / А. Шалахоўскі // Голас Радзімы. — 1998. - 6 жніўня. - С. 7.

Пра вынікі Рэспубліканскага агляду творчай моладзі тэатраў драмы і лялек, дзе ў намінацыі "Аўтарская работа, увасобленая на сцэне" перамог Ігар Сідарук з Брэсцкага абласнога тэатра лялек.

**Кісліцына, Г.** Беларускі постмадэрнізм: спроба індэнтыфікацыі / Г. Кісліцына // Культура. – 1996. - 3-9 верасня. - С. 6-7.

У тым ліку аб творчасці Ігара Сідарука.

**Григалюнас, В.** Боги не играют в куклы, но случается наоборот / В. Григалюнас // Вечерний Брест. – 1996. - 21 июня. - С. 8.

Интервью с режиссёром, который ставит в Брестском театре кукол спектакль "Дрэва багоў" по пьесе И. Сидорука.

**Савіцкая, А.** "Ці уваскрэснем мы душою… / А. Савіцкая // Мастацтва. – 1996. - № 7. - С. 32-35.

Аб творчасці драматурга І. Сідарука.

**Садаўнічы, Э.** Містэрыя "Калючага дроту" : Парадоксы сучаснай беларускай драматургіі : [у тым ліку ўпамінаецца п’еса "Галава" І. Сідарука] / Э. Садаўнічы // Роднае слова. – 1996. - № 12. – С. 61.

**Городская** панорама // Вечерний Брест. – 1995. – 14 июля.

Театр-лаборатория национальной драматургии «Вольная сцена» со спектаклем по пьесе И. Сидорука «Голова» приглашен на Каирский фестиваль экспериментальных театров.

**Фонд** Сороса поможет поставить в Бресте новый спектакль по пьесе И. Сидорука "Дерево богов"' в театре кукол // Брестский курьер. – 1995. – 15-21 июня. - С. 12.

**Бельскі, А.** Пуцявінамі абнаўлення : маладая беларуская драматургія 80-х - пач. 90-х гг. : [у тым ліку аб драматурге І. Сідаруке] / А. Бельскі // Роднае слова. – 1994. - № 1. - С. 28-30.

**Бунеева, Л.** "Дзверы у неба" : Ігар Сідарук і яго героі / Л. Бунеева // Тэатральная Беларусь. – 1994. – № 1. - С. 42-43.

**Зелка, К.** "У Віфліяме божая матка нарадзіла дзіцятка / К. Зелка // Брестский курьер. – 1994. – 6 декабря. - С. 9.

Калядная прэм’ера па п’есе І. Сідарука "Збівацель" у тэатры лялек.

**Круг** чтения // Брестский курьер. – 1994. - 4-11 августа. - С. 9.

Выйшла кніга І. Сідарука "Павучальныя гісторыі дзядзечкі Сідарука".

**Лаўшук, С.** На вольнай сцэне... "вольны дух" / С. Лаўшук // Рэспубліка. – 1994. - 16 ліпеня. - С. 5.

Аб п’есе "Галава” І. Сідарука.

**Сянкевіч, М.** Пачытаем разам / М. Сянкевіч // Народная трыбуна. – 1994. - 5 лістапада.

Аб кнізе І. Сідарука "Павучальныя гісторыі дзядзечкі Сідарука”.

**У выдавецтве** "Талер” выйшла кніга для дзяцей Ігара Сідарука // Кобрынскі веснік. – 1994. - 26 ліпеня.

**Вкратце** : В областном театре кукол прошла премьера спектакля "Меч ангела" по пьесе Ігоря Сидорука // Брестский курьер. – 1993. - 9-15 апреля. – С. 1.

**"Цветы** под дождем" // Знамя юности. – 1993. - 18 ноября.

Оперу с таким названием по одноименной пьесе И. Сидорука написала третьеклассница музыкальной школы г. Лиды.

**Гальпяровіч, Н.** Не будзем цешыцца ілюзіямі : [у т. л. пра кнігу І. Сідарука "Чарнабел"] // Літаратура і мастацтва. – 1992. - 30 кастрычніка. – С. 12.

**Творы** ўдзельнікаў рэспубліканскага семінара маладых літаратараў : [сярод іх Ігар Сідарук] // Маладосць. - 1991. - № 7. - С. 14, 28-41, 44-45.

# СПІС ПЕРЫЯДЫЧНЫХ ВЫДАННЯЎ, МАТЭРЫЯЛЫ З ЯКІХ УКЛЮЧАНЫ Ў ПАКАЗАЛЬНІК

ARCHE
Беларусь сегодня (СБ)
Белая Вежа
Брестский курьер
Веснік Брэсцкага ўніверсітэта
Весці Нацыянальнай Акадэміі Навук Беларусі
Вечерний Брест
Голас Радзімы
Дзеці і мы
Дзеяслоў
Заря
Знамя юности
Камуністычная праца
Кобрынскі веснік
Краязнаўчая газета
Культура
Літаратура і мастацтва
Маладосць
Мастацтва
Народная трыбуна
Наша слова
Неман
Полымя
Правінцыя
Роднае слова
Рэспубліка
Тэатральная Беларусь
Чырвоная змена

# ЗМЕСТ

**Прадмова** 3

**Сідарук Ігар: «І раптам успомніць, азірнуцца…**:»: *напярэдадні юбілею* 5

**Жыццёвы прынцып: «Рабіць тое, што я хачу, і што падабаецца**»: біяграфічны артыкул 9

**Драматург, паэт, празаік** 14

**Бібліяграфічныя матэрыялы** 19

*Творы І. Сідарука* 19

*Аб жыцці і творчасці І. Сідарука* 29

**Спіс перыядычных выданняў**, матэрыялы з якіх уключаны ў біябібліяграфічны даведнік 38

Даведачнае выданне

# Ігар Сідарук

## *«Іншым разам радок дыктуе само неба…»*

*біябібліяграфічны паказальнік*

Складальнік
Святлана Курачук

Камп’ютарная вёрстка С. Д. Курачук
Дызайн вокладкі П. С. Грыневіча

Надрукавана на камп’ютарна-выдавецкай сістэме
Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі
Вул. Маршала Жукава, 12, 225306, г. Кобрын
Цэнтральная раённая бібліятэка
E-mail: kobrinlib@gmail.com
www.krcls.by